***Губская, В.М. Класіка ХХ стагоддзя: прыхаваныя таямніцы рамана «Віленскія камунары» М. Гарэцкага / В.М. Губская. – Мінск : РІВШ, 2016. – 108 с.***

Плён працы М. Гарэцкага неаднаразова станавіўся аб’ектам навуковага даследавання (даследаванні А. Адамовіча, Д. Бугаёва, Т. Дасаевай, Г. Кажамякіна, В. Максімовіча, М. Мушынскага, Л. Сіньковай, Т. Тарасавай, І. Шаладонава і інш.). Нягледзячы на пільную ўвагу літаратуразнаўцаў і крытыкаў да спадчыны класіка ўсё ж застаюцца пэўныя лакуны, што патрабуюць неадкладнага разгляду. Змена ідэалагічнай парадыгмы, актуальныя методыкі працы з мастацкім матэрыялам, знаёмства з раней засакрэчанымі дакументальнымі крыніцамі дазваляе па-іншыму зірнуць на здавалася б знаёмыя тэксты. Так сталася з раманам «Віленскія камунары» М. Гарэцкага: на пачатку XXI ст. узнікла патрэба звярнуцца да гэтага адмысловага тэксту.

Праца В. Губскай «Класіка ХХ стагоддзя: прыхаваныя таямніцы рамана «Віленскія камунары» М. Гарэцкага» ўяўляе сабой комплекснае даследаванне твора беларускага класіка. Навукоўца абапіраецца на дасягненні сучаснага гарэцказнаўства («Трактоўкі рамана М. Гарэцкага “Віленскія камунары” ў беларускім літаратуразнаўстве»), пашырае перспектывы вывучэння спадчыны пісьменніка, уводзячы яе ў шырокі кантэкст заходнееўрапейскай літаратуры. У кампаратыўным рэчышчы вытрыманы наступныя раздзелы дапаможніка: «Элементы авантурнага жанру ў канцэпцыі рамана М. Гарэцкага “Віленскія камунары”» і «Актуалізацыя архетыпа трыкстара ў рамане М. Гарэцкага “Віленскія камунары”». Дадзеныя часткі кнігі дазваляюць прасачыць як тыпалагічныя паралелі, што яднаюць кнігу з асноўнымі набыткамі сусветнай літаратуры мінулых эпох («Жыццё Ласарыльё з Тормеса», «Гісторыя жыцця прайдзісвета на імя дон Паблас» Ф. дэ Кеведа, «Сімпліцый Сімпліцысімус» Г.Я.К. Грымельзгаўзена, персанажы «Дэкамерона» Дж. Бакача, «Тыль Уленшпігель» Ш. дэ Кастэра, «Прыгоды ўдалага ваякі Швейка» Я. Гашака), так і дэталёва засяродзіцца на адметнасцях твора, што ўзнік у надзвычай складаны гістарычны перыяд, калі мастацтва слова пакутавала ад запатрабаванняў звышпільных цэнзараў.

Аўтар дапаможніка разглядае спецыфіку аповеду ў раздзеле «Наратыўная структура “Віленскіх камунараў”. Поліфанічная прырода рамана». Падкрэсліваецца, што вобразы аўтара, апавядальніка і галоўнага персанажа патрабуюць уважлівага прачытання, бо кожны з іх надзелены пэўнымі светапогляднымі характарыстыкамі, што ўзаемадапаўняюць ці аспрэчваюць адна адну. Тым самым дасягаецца поліфанічнае гучанне ўсяго твора.

Механізм судакранання мастацкага вымыслу і гістарычна абумоўленай рэчаіснасці пададзены ў раздзелах «Роля біяграфічных элементаў у рамане М. Гарэцкага “Віленскія камунары”» і «Гістарычны аспект рамана М. Гарэцкага “Віленскія камунары”». Аўтар даследавання доказна сцвярджае, што ў тэксце рамана зашыфраваны шэраг аўтабіграфічных фактаў, што становяцца відавочнымі пасля дэталёвага знаёмства з жыццёвым і творчым шляхам пісьменніка (у тым ліку, дзякуючы ўспамінам і лістам родных).

Пасля кожнага раздзела пададзены пытанні і заданні, што дазваляюць арганізаваць кантроль ведаў па засвоенаму матэрыялу і даюць магчымасць самастойна паразважаць над пэўнымі праблемамі, звязанымі з раманам.

Багаты бібліяграфічны спіс дазваляе працягнуць самастойнае даследаванне таямніц творчасці М. Гарэцкага.

Дапаможнік карысны навукоўцам, выкладчыкам гісторыі беларускай і сусветнай літаратуры, аспірантам і магістрантам, студэнтам-філолагам, усім, хто цікавіцца айчынным літаратурным працэсам, яго тыпалагічнымі сувязямі з сусветным мастацтвам слова.

***канд. філал. навук, дац. З.І. Трацц‌як***
***(Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт)***